УДК 94(476)

# АЛЯКСАНДР РЫГОРАВІЧ СВЯРГУН: ПАДПОЛЬШЧЫК, ПАРТЫЗАН, ДЭПУТАТ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

***В. А. Баран, выкладчык цыклавой камісіі сацыяльна-гуманітарных прадметаў, аспірант***
***Навуковы кіраўнік: А. А. Савіч, к. г. н., дацэнт***
***Політэхнічны каледж, філіал БрДТУ, Брэст, Беларусь***

*Анатацыя.* У артыкуле прэзентаваны жыццевы шлях Аляксандра Рыгоравіча Свяргуна, актыўнага ўдзельніка нацыянальна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг., члена Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ). Паказаны ўдзел у падпольнай барацьбе супраць польскіх улад, прасочваецца партызанскі рух ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Праведзены аналіз далейшай палітычнай кар'еры А. Р. Свяргуна ў Савецкай Беларусі. Артыкул накіраваны на асвятленне біяграфіі малавядомага, але значнага дзеяча беларускай гісторыі, раскрыцце яго ролі ў працэсе ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР, вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, у пасляваенным аднаўленні і развіцці рэспублікі.
*Ключавыя словы:* Заходняя Беларусь, Камуністычная партыя Заходняй Беларусі, Беларуская сялянска-работніцкая грамада, Народны Сход Заходняй Беларусі, Вялікая Айчынная вайна, Косаўская раенная партыйная арганізацыя, Вярхоўны Савет БССР.

Аляксандр Рыгоравіч Свяргун – імя, непарыўна звязанае з гісторыяй барацьбы за ўз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР і станаўленне Савецкай Беларусі. Аддаўшы многія гады падпольнай рабоце ў складзе КПЗБ, ен прайшоў шлях ад шэраговага агітатара да актыўнага ўдзельніка партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны і, нарэшце, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР.

А. Р. Свяргун нарадзіўся ў 1903 г. у в. Гічыцы Слонімскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Івацэвіцкі раен Брэсцкай вобласці) у беднай сялянскай сям'і [1, арк. 223]. Сялянскі хлопчык вучыўся ў мясцовай царкоўнапрыхадской школе, а падчас Першай сусветнай вайны, у 1915 г., разам з сям'ей падаўся ў бежанства ў Расію, дзе як падлетак паступіў на працу на чыгунку рамонтным рабочым. У пошуку хлеба ў 1917 г. сям'я пераехала ў Сібір, у Алтайскую губерню, сяло Бароўскае, дзе А.Р. Свяргун працаваў па найме ў кулакоў, потым – на масларобным заводзе. На Радзіму сям'я вярнулася толькі ў 1923 г. і пасялілася ў чужой хаце, бо свая за гады ваеннага ліхалецця была разрабавана [1, арк. 223; 2, с. 3]. У сваей аўтабіяграфіі А. Р. Свяргун успамінае: "Территория моего место рождения была оккупирована панской Польшей. Очутившись таким образом в Польше, мы столкнулись с большими трудностями, не было жилья, а также средств к существованию, тяжело было найти работу. Был вынужден пойти лесорубом, тяжелый физический труд, низкая заработная плата, социальный и национальный гнет, все ужасы, лишения, в каких жили белорусы, были невыносимые. Их поправить можно было лишь путем упорной борьбы. Я вступил в 1923 г. в ряды КПЗБ. Ибо это была единственная политическая партия, которая вела борьбу за освобождение трудящихся." [1, арк. 223]. У 1923–1927 гг. Свяргун быў членам Косаўскага раеннага і Слонімскага акруговага камітэтаў КПЗБ, ствараў ячэйкі КПЗБ і КСМЗБ на Слонімшчыне, веў прапагандысцкую работу сярод насельніцтва. Стаў адным з арганізатараў выступлення працоўных г. Косава ў абарону Беларускай

сялянска-рабочай грамады [3, с. 272]. У 1926 г. Аляксандр Рыгоравіч быў прызваны ў польскую армію, дзе праслужыў 6 месяцаў. Будучы ў войску, стварыў ячэйку з 7 чалавек і праводзіў працу сярод салдат. Пасля звальнення з польскага войска вярнуўся ў сваю родную веску і зноў пачаў партыйную працу [1, арк. 223].

У сакавіку 1927 г. паліцыя арыштавала амаль увесь склад Косаўскага падпольнага райкама КПЗБ на чале з сакратаром Пятром Улосаўцам. У лік арыштаваных трапіў і А. Р. Свяргун. Усяго на Косаўшчыне было арыштавана больш за 200 чалавек. Шматлікія арышты ў сувязі з узмацненнем рэвалюцыйнага руху паліцыя правяла ў той час і ў іншых вёсках Заходняй Беларусі. Для таго, каб аслабіць размах рэвалюцыйнай барацьбы на "ўсходніх крэсах", як палякі называлі Заходнюю Беларусь, запалохаць насельніцтва, польскія ўлады неўзабаве арганізавалі судовы працэс над палітычнымі зняволенымі, які называўся працэсам "75-ці". Пачаўся гэты працэс 9 ліпеня 1929 г. у г. Гродна. Зал акруговага суда быў перапоўнены. Пасля ўсіх фармальнасцяў пачаліся допыты абвінавачваемых. Усе арыштаваныя адмовіліся ад прад'яўленых ім абвінавачанняў. Прызнаўся ў прыналежнасці да КПЗБ па даручэнні турэмнага партыйнага камітэта былы сакратар Косаўскага падпольнага райкома КПЗБ М. Л. Пераралоцкі, якому ўжо немагчыма было скрыць гэтага. Суд працягваўся 10 дзён. Раніцай і ўвечары, калі пераводзілі арыштаваных па 15 чалавек у "карэтках", падобных на сабачую будку, з турмы ў суд і з суда ў турму, нягледзячы на забарону, спявалі "Інтэрнацыянал", "Варшавянку", "Марсельезу" і іншыя рэвалюцыйныя песні, выкрыквалі заклікі да барацьбы супраць сваволства польскіх улад. Вуліцы Гродна, па якіх везлі падсудных, заўседы былі запоўнены народам, простыя людзі глыбока спачувалі і нярэдка падхоплівалі іх песні і заклікі [4, с. 173–174].

Пасля васьмігадовага турэмнага зняволення, у сакавіку 1935 г. ЦК КПЗБ накіраваў А. Р. Свяргуна працаваць у Косаўскую раенную партыйную арганізацыю, якая была амаль цалкам разгромлена дэфензівай. Аляксандру Рыгоравічу нядоўга прыйшлося пабыць на волі. 31 жніўня 1935 г. па даносе правакатара А. Р. Свяргун быў схоплены паліцыяй і зноў асуджаны – на шэсць гадоў турмы [5, с. 117]. Але ў гэты час была ў Польшчы амністыя, і прысуд быў паменшаны на 1/3, г. зн. прыйшлося сядзець 4 гады. Такім чынам, за ўвесь час давялося адсядзець 12 гадоў турэмнага зняволення. КПЗБ дзейнічала нават у турме. І турмы, нягледзячы на суровы рэжым, былі кузняй выхавання і загартоўвання кадраў КПЗБ. За гады турэмнага зняволення Свяргун некалькі разоў быў абраны ў склад праўлення камуны палітвязняў, а таксама сакратаром турэмнай партыйнай арганізацыі, так званай партыйнай тройкі. Па другім прыгаворы сядзеў у такіх турмах гарадоў Пружаны, Седлец, Драгобыч [1, арк. 223; 6, арк. 3].

У пружанскай турме сядзелі пераважна маладыя падпольшчыкі, якія яшчэ не мелі вопыту рэвалюцыйнай барацьбы. Не было ў турме і партыйнай арганізацыі, не паступалі сюды газеты і кнігі, не дазвалялася больш аднаго раза ў месяц пісаць і атрымліваць пісьмы. Такім чынам, зняволеныя былі пазбаўлены сувязі з жыццём на волі. Апынуўшыся ў такім становішчы, А. Р. Свяргун пачаў звязвацца са зняволенымі, расказваць ім пра тое, як у другіх турмах змагаюцца за паляпшэнне сваіх бытавых умоў. Акрамя вусных гутарак, таемна ад наглядчыкаў на тонкай курыльнай паперы пісаў даклады на палітычныя тэмы, у якіх даваў парады зняволеным, як трэба змагацца з адміністрацыяй за свае правы.

Прапановы А. Р. Свяргуна былі падтрыманы ўсімі зняволенымі, асабліва моладдзю, большасць якой былі камсамольцы. Неўзабаве ўсе аднадушна запатрабавалі ад турэмнай адміністрацыі допуску ў турму газет, кніг, а таксама паляпшэння харчавання і бытавых умоў. Усе патрабаванні былі задаволены, аднак вялікім ударам для ўсіх была навіна аб роспуску КПЗБ у 1938 г. [5, с. 117; 7, с. 117]. Выйшаўшы на волю ў 1939 г., А. Р. Свяргун вярнуўся ў сваю веску, а 17 верасня кіраваў узброеным паўстаннем, быў начальнікам Народнай гвардыі ў Івацэвічах да прыходу савецкіх воінскіх часцей. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі быў абраны дэпутатам ад Гічыцкай выбарчай акругі ў Народны Сход Заходняй Беларусі.

Вярнуўшыся з Масквы, працаваў загадчыкам аддзела Косаўскага выканкама па сакавік 1940 г. У сакавіку быў абраны старшынёй Косаўскага гарадскога савета. У выніку выбараў у 1940 г. стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання [1, арк. 224]. З самага пачатку Вялікай Айчыннай вайны А. Р. Свяргун быў у радах Чырвонай арміі, а з 1943 г. удзельнічаў у партызанскім руху на Брэстчыне. За забеспячэнне партызан важнымі грузамі ва ўмовах пагрозы жыццю ен быў узнагароджаны Ордэнам Чырвонай Зоркі [1, арк. 224; 2, с. 3]. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў некаторы час знаходзіўся на савецкай працы ў Брэсце, потым працаваў на пасадзе старшыні Пружанскага гарвыканкама (1951–1955 гг.), быў дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР першага склікання (1940–1947 гг.) [1, арк. 224].

Такім чынам, жыццевы шлях А. Р. Свяргуна – гэта яскравы прыклад адданасці сваім перакананням, мужнасці і самаахвярнага служэння народу. Яго біяграфія адлюстроўвае пераломныя моманты гісторыі Беларусі. Ен прадстаўнік таго пакалення, якое балюча ўспрыняло польскую акупацыю і ўключылася ў актыўную падпольную дзейнасць у шэрагах КПЗБ. А. Р. Свяргун быў гераічным удзельнікам партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны, працаваў на адказных дзяржаўных пасадах, з'яўляўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Яго імя застанецца ў памяці нашчадкаў як сімвал стойкасці, прынцыповасці і вернасці ідэалам справядлівасці і роўнасці. Вывучэнне яго жыццевага шляху з'яўляецца важным для разумення гісторыі Беларусі і выхавання патрыятызму ў маладога пакалення.

**Спіс выкарыстаных крыніц**

1. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1099.

2. З клопатамі аб усей сям'і і аб Радзіме // Івацэвіцкі веснік. – 2024. – 18 вер. – № 70.

3. Клімец, М. П. Свяргун Аляксандр Рыгоравіч / М. П. Клімец // Беларуская энцыклапедыя. Рэле – Слаявіна ; гал. рэд. – Г. П. Пашкоў. – Мінск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2002. – Т. 14. – С. 512.

4. У суровыя гады падполля: успаміны былых членаў КПЗБ – актыўных удзельнікаў рэвалюц. руху ў Зах. Беларусі / Ін-т гісторыі партыі ЦК КП Беларусі – філіял Ін-та марксізму-ленінізму пры ЦК КПСС; склад.: М. С. Арэхва [і інш.]. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1958. – 361 с.

5. Памяць : Івацэвіцкі раен : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раенаў Беларусі / уклад: М. В. Банасевіч [і інш] ; рэдкал.: В. П. Касько [і інш]. – Мінск : БелТА, 1997. – 496 с.

6. НАРБ. – Ф. 1440. Воп. 3. Спр. 1103.

7. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Пружанскага раена / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]; маст. А. М. Хількевіч. – Мінск : БелЭн, 1992. – 245 с.